УДК 94(476)“1945/1956”:364.694

# Пасляваенная штодзённасць інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны

**Марцынкевіч І.А.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт”, Віцебск***

*Узрастанне даследчай цікавасці да сацыяльнай гісторыі вызначае актуальнасць аналізу штодзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў першыя пасляваенныя гады.*
*Мэта працы – паказаць асноўныя праблемы паўсядзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны БССР.*
***Матэрыял і метады.*** *Даследаванне ажыццяўлялася на аснове інфармацыйнай і справаздачнай дакументацыі камітэтаў, мясцовых партыйных органаў, а таксама Міністэрства дзяржаўнага кантролю БССР, якая знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.*
***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Аналіз архіўных крыніц сведчыць, што існавалі істотныя хібы ў выплаце пенсій і матэрыяльных дапамог, працаўладкаванні і навучанні інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, іх медыцынска-бытавым абслугоўванні, арганізацыі працы дамоў інвалідаў. Найбольш частымі парушэннямі, з якімі сутыкаліся дэмабілізаваныя ў адносінах да сябе, з'яўляліся няправільнае размеркаванне грашовых выплат і іншых дапамог, а таксама працаўладкаванне інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.*
***Заключэнне.*** *Пасляваенная штодзённасць інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны была супярэчлівай і неаднaзначнай. Меры, што прымаліся органамі ўлады для паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў франтавікоў, прыносілі пэўныя вынікі. Аднак працэс укаранення ў практыку рашэнняў заставаўся недасканалым. На месцах да інвалідаў вайны было таксама неадназначнае стаўленне. Асабліва востра гэта праблема адчувалася ў плане працоўнага забеспячэння.*
***Ключавыя словы:*** *пасляваенная штодзённасць, аднаўленне, інваліды Вялікай Айчыннай вайны, дэмабілізаваныя, сацыяльнае забеспячэнне, дамы інвалідаў, працаўладкаванне.*

*(Ученые записки. – 2014. – Том 18. – С. 73–81)*

# Postwar Daily Life of the Disabled and Participants of the Great Patriotic War

**Martsynkevich I.A.**
***Educational establishment “Vitebsk State Order of Peoples' Friendship Medical University”, Vitebsk***

*The increase of research interest in social history determines the relevance of the analysis of everyday life of the disabled and participants of the Great Patriotic War in the early postwar years. The aim of the study is to show the main problems of everyday life of the disabled and participants of the Great Patriotic War of the BSSR.*
***Material and methods.*** *The study was carried out on the basis of information and reports of documentation of committees, local party organs, as well as the Ministry of state control of BSSR, which is contained in the National Archives of the Republic of Belarus.*
***Findings and their discussion.*** *The analysis of archival sources indicates that the inspections conducted by the Ministry of state control of the BSSR pointed out significant deficiencies in the pension payment of and cash benefits, resettlement and training of disabled persons and participants of the Great Patriotic War, medical care and domestic services, the organization of nursing homes for persons with disabilities. The most frequent violations which the demobilized faced appeared to be incorrect distribution of cash payments and other benefits; acute and controversial issue was the resettlement of disabled persons and participants of the Great Patriotic War.*
***Conclusion.*** *Post-war daily life of the disabled and participants of the Great Patriotic War was controversial and ambiguous. Measures taken by the authorities to improve living conditions of soldiers brought some results. However, the process of implementation of decisions remained imperfect. At the local level the attitude to disabled war veterans was also ambiguous. This problem was particularly acute regarding employment security.*
***Key words:*** *post-war life, restoration, the disabled of the Great Patriotic War, demobilized, social security, nursing homes for disabled, employment.*

*(Scientific notes. – 2014. – Vol. 18. – P. 73–81)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* janka.m@mail.ru – **І.А. Марцынкевіч**

Найбольш складанай катэгорыяй грамадзян з пункту гледжання абароны іх інтарэсаў застаюцца інваліды. Вывучэнне і асэнсаванне пасляваеннай штодзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны дае магчымасць выявіць памылкі і дасягненні ў справе сацыяльнага забеспячэння, што мае вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Не ўлічваць гэты вопыт у сённяшніх умовах – значыць ігнараваць той назапашаны патэнцыял, які быў распрацаваны і правераны на практыцы.

Мэта артыкула – паказаць асноўныя праблемы паўсядзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны БССР у першыя пасляваенныя гады.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне ажыццяўлялася на аснове інфармацыйнай і справаздачнай дакументацыі камітэтаў, мясцовых партыйных органаў, а таксама Міністэрства дзяржаўнага кантролю БССР, якія знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.

Метадалагічнай базай даследавання з'яўляюцца асноватворныя прынцыпы гістарычнай навукі – гістарызм, аб'ектыўнасць, навуковасць. Акрамя агульных метадалагічных прынцыпаў пры правядзенні даследавання выкарыстаны спецыяльна-гістарычныя метады. З дапамогай гісторыка-генетычнага метаду аналізавалі сацыяльныя адносіны з інвалідамі і ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны і ўнутраныя працэсы, абумоўленыя гэтымі ўзаемаадносінамі, разглядаліся ў развіцці. Гісторыка-генетычны метад дазволіў вылучыць фактары, пад уплывам якіх змяняліся адносіны да таго ці іншага напрамку сацыяльнага забеспячэння дэмабілізаваных у БССР і як гэта ўплывала на змены ў жыцці саміх былых абаронцаў Радзімы ў дадзены перыяд. Гісторыка-параўнальны метад дазволіў суаднесці падыходы да інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны ў розныя перыяды даследуемага часу. Гісторыка-сістэмны метад даў магчымасць комплексна разгледзець пытанні пасляваеннай штодзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны на фоне сацыяльных і палітычных працэсаў, якія мелі месца ў вывучаемы перыяд.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пасляваеннае савецкае грамадства ўяўляла сабой складаны сацыяльна-псіхалагічны феномен. Вайна змяніла яго склад і дэмаграфічны баланс, унесла карэктывы ў нормы жыцця і каштоўнасці людзей. Праблема пераходу ад вайны да міру стаяла перад усім пасляваенным грамадствам. Аднак у найбольшай ступені яна закранула франтавікоў, якія на працягу вайны былі “адарваны” ад мірных абставін. Перажытыя падчас вайны страты, а потым матэрыяльна-бытавая незабяспечанасць, з якой прыйшлося сутыкнуцца асабліва ў першыя пасляваенныя гады многім інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, паглыбляліся дадатковымі цяжкасцямі псіхалагічнага характару, звязанымі з пераключэннем на новыя задачы мірнага ўладкавання [1]. Асаблівую разгубленасць перад дэмабілізацыяй адчувалі маладыя ўдзельнікі і інваліды вайны 1923–1927 гг. нараджэння, тыя, хто пайшоў на фронт адразу пасля школы, не атрымаўшы пэўнай прафесійнай адукацыі, і быў, такім чынам, не прыстасаваны да мірнага жыцця [2, с. 28–29].

Пасляваеннае жыццё ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны было цяжкім. Праверкі, якія праводзіліся Міністэрствам дзяржаўнага кантролю БССР, паказвалі істотныя хібы ў выплаце пенсій і матэрыяльных дапамог, працаўладкаванні і навучанні дэмабілізаваных, іх медыцынска-бытавым абслугоўванні, арганізацыі працы дамоў інвалідаў. Толькі за чацвёрты квартал 1945 г. і першы квартал 1946 г. было праведзена 2953 праверак, звязаных з выкананнем законаў, якія абаранялі правы інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Іх вынікі паказвалі, што ў паўсядзённым жыцці былыя абаронцы Радзімы сутыкаліся з тыповымі праблемамі, якія былі абумоўлены як недасканаласцю самой сістэмы сацыяльнага забеспячэння, так і чалавечым фактарам на месцах [3, арк. 126].

Найбольш частым парушэннем, з якім мелі справу інваліды і ўдзельнікі вайны ў адносінах да сябе, з'яўлялася няправільнае размеркаванне грашовых выплат і іншых дапамог. Так, у канцы 1945 – пачатку 1946 г. пракуратурай Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці было выяўлена, што для дэмабілізаваных у раённы спажывецкі саюз паступілі прамысловыя і харчовыя тавары, але па прызначэнні яны так і не былі рэалізаваны, а былі раскрадзены [3, арк. 126].

Падчас праверкі высветлілася, што загадчык базы райспажыўсаюза Тураўскага раёна Палескай вобласці Тарасюк сумесна з загадчыкам магазіна № 1 гарадскога пасёлка Тураў В. Лазута прысвоілі 32 кг цукру, 40 кг цукерак, 9 кг пячэння, якія былі прызначаны для дзяцей, дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі.

Пры складанні спісаў на выдачу харчовых прадуктаў дэмабілізаваным у іх уносіліся розныя асобы, якія не мелі ніякага дачынення да дэмабілізаваных [3, арк. 126].

У Мазырскім гарсабесе Палескай вобласці загадчык аддзела Раманоўскі пры размеркаванні святочных падарункаў, прызначаных для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, уключыў у спісы сваю жонку Бандарэнка, якой было выдадзена 4 пайкі. Акрамя таго, разам з галоўным бухгалтарам Сіўчанка і інструктарам Сазыкінай, Раманоўскі пры складанні на атрыманне інвалідамі вайны пайкоў уключыў у спіс тых, хто выбыў з горада, і такім чынам прысвоіў пэўную колькасць пайкоў.

Пры праверцы Талачынскага аддзела сацыяльнага забеспячэння было выяўлена, што з прынятых на ўлік 1010 інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны 460 атрымлівалі пенсіі без адпаведных дакументаў аб яе прызначэнні. У Смалявічах інваліды вайны не забяспечваліся прадуктамі харчавання. Па гэтай прычыне на працягу 3 месяцаў яны не атрымлівалі належнай нормы тлушчоў [3, арк. 126].

Абыякавыя адносіны да патрэб дэмабілізаваных і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны з боку органаў сацыяльнага забеспячэння прыводзілі да абуральных выпадкаў. Да прыкладу, рашэннем Старабінскага райвыканкама Бабруйскай вобласці была прынята пастанова аб выдачы каровы пацярпеламу ў перыяд акупацыі інваліду Вялікай Айчыннай вайны Яновічу. Аднак пасля праведзенай праверкі высветлілася, што ён не толькі не з'яўляўся інвалідам вайны, а быў падчас акупацыі старастам на службе ў немцаў.

Прадстаўнікі ўлады на месцах не заўсёды належна сачылі за надзённымі патрэбамі былых абаронцаў Радзімы. Злоўжыванне ўладай і імкненне да ўласнага ўзбагачэння за кошт дэмабілізаваных стала адной з негатыўных праяў пасляваеннай штодзённасці. У калгасе імя Кірава Рудакоўскага сельскага савета Віцебскай вобласці замест аказання дапамогі па будаўніцтве жылля дэмабілізаваным створаныя для гэтага брыгады працавалі там, дзе калгаснікі маглі заплаціць рабочым большую суму грошай. Старшыня калгаса Царкоўскі ведаў пра гэта, але ніякіх мер не прымаў. У калгасе Чапаева Віцебскай вобласці старшыня калгаса на працягу года не пабудаваў ніводнага дома для дэмабілізаваных і ваеннаслужачых, хоць некаторыя з іх пражывалі ў зямлянках. Арганізаваныя брыгады не працавалі на працягу года, акрамя таго, што адбудавалі некалькі гаспадарчых пабудоў асабіста старшыні калгаса Жураву [3, арк. 138].

Праверкай у аддзеле дзяржзабеспячэння Тураўскага раёна Палескай вобласці было ўстаноўлена, што пры складанні спісаў на выдачу харчовых прадуктаў дэмабілізаваным у яго ўносіліся розныя асобы, якія не мелі ніякага дачынення да дэмабілізаваных. Пракурорам Тураўскага раёна было ўстаноўлена, што старшыня Беляціскага сельсавета Барысаўскага раёна Мінскай вобласці Грук не аказаў дапамогі дэмабілізаваным пры пабудове жылля, у набыцці паліва, прадуктаў харчавання і гаспадарчага інвентару.

Пасляваенная рэчаіснасць найбольш складана ўспрымалася тымі, хто страціў здароўе на фронце і застаўся без сям'і. Для інвалідаў вайны, што былі вымушаны жыць у інтэрнатах, мірнае жыццё стала сапраўдным выпрабаваннем. Яшчэ больш ускладняла сітуацыю тое, што ў працоўных інтэрнатах інваліды фактычна былі прадастаўлены самі сабе, цэлымі днямі туляліся па тэрыторыі без усялякіх заняткаў ці працы. Гэта згубна адбівалася на іх псіхалагічным і маральным стане. П'янства, бойкі, самавольныя сыходы з тэрыторыі інтэрната, выпадкі крадзяжу былі звыклай з'явай для жыхароў інтэрната. Ацяжараныя сваім становішчам, яны знаходзіліся ў падаўленым стане і выказвалі "нездаровыя думкі" пра самагубства, скардзіліся на жыццё і ўмовы, у якіх вымушаны былі жыць. Складанасць сітуацыі заключалася ў тым, што большасць з іх не мела родных і блізкіх, што фактычна пазбаўляла магчымасці змяніць месца пражывання.

Мэтай адной з праверак, арганізаванай Міністэрствам дзяржаўнага кантролю, стала абследаванне стану Хойніцкага працоўнага інтэрната інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, які быў арганізаваны па рашэнні СНК БССР у 1944 годзе на базе былога лесапільнага завода на станцыі Аўрамаўская Палескай вобласці. Будынак знаходзіўся ў 18 км ад раённага цэнтра Хойнікі, да абласнога цэнтра было 90 км. Працоўны інтэрнат меў 5 памяшканняў, 2 з якіх былі прызначаны для размяшчэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якія прыбывалі туды па накіраванні Міністэрства сацыяльнага забеспячэння БССР. Для прыёма інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны было падрыхтавана толькі адно памяшканне барачнага тыпу. Другое патрабавала капітальнага рамонту і не выкарыстоўвалася. Жылы дом

інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны быў не пабелены, з пацямнелымі ад часу сценамі і незашклёнымі вокнамі. Падлога знаходзілася ў брудным стане. У палатах не выконваліся самыя элементарныя правілы санітарыі і гігіены: падлога мылася вельмі рэдка, сцены, столь і вокны не праціраліся, адсутнічалі сметніцы. Гарачай вады не было. Інваліды, у сваёй большасці, хадзілі ў бруднай і абарванай вопратцы, без асаблівага дагляду персаналу. З-за антысанітарных умоў развялося многа мух, а размяшчэнне інтэрната ў лясной мясцовасці паміж балотамі абумовіла з'яўленне вялікай колькасці камароў, якія моцна заядалі жыхароў.

Нярэдкімі з'яўляліся выпадкі, калі з багны ў памяшканне запаўзалі змеі. Побач з інтэрнатам не было ніякай ракі ці іншага маляўнічага месца, дзе можна было б адпачыць і не думаць пра свой горкі лёс. Тое, што ўстанова размяшчалася далёка ад горада, а ў распараджэнні была толькі адна машына, часта з'яўлялася прычынай несвоечасовага забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны прадуктамі харчавання. Гэта прыводзіла да росту незадаволенасці сярод іх. За час існавання інтэрната з яго збегла 25 інвалідаў, а колькасны склад інтэрната ніколі не перавышаў 60 чалавек, хаця быў разлічаны ўтрымліваць да 200 інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны [4, арк. 89].

Пасля арганізацыі інтэрната ў 1944 годзе Наркамсабес накіраваў туды 63 інвалідаў I і II групы, з якіх на працягу года 9 выбыла самавольна, 5 – на працаўладкаванне і 2 – на радзіму. Такім чынам, да канца 1944 г. у інтэрнаце знаходзілася толькі 47 чалавек. У 1945 г. на пражыванне было накіравана 19 чалавек, а да канца 1945 года іх было ўжо 52. Прычым самавольна выбыла 7 чалавек, на працаўладкаванне накіравана 4, а на радзіму, па месцы ранейшага жыхарства, выехалі 3 чалавекі [4, арк. 91].

Інваліды Вялікай Айчыннай вайны больш чым іншыя былыя франтавікі мелі патрэбу не толькі ў хірургічным і тэрапеўтычным лячэнні, але і ў псіхалагічнай падтрымцы. У Хойніцкім інтэрнаце знаходзіліся толькі медсястра і адзін урач, які працаваў па сумяшчальніцтве. У выніку медагляд быў наладжаны нерэгулярна, медыцынскія кансультацыі не праводзіліся, а хуткая дапамога аказвалася несвоечасова. Так, інвалід Вялікай Айчыннай вайны Н.С. Барадзін, які захварэў малярыяй, на працягу 4 дзён не мог атрымаць ніякай медыцынскай дапамогі, паколькі адсутнічалі элементарныя медыкаменты для лячэння. Да канца вайны толькі трэцяя частка інтэрнатаў мела ўрача, не кажучы пра якаснае медыцынскае абслугоўванне [2, с. 29].

Хойніцкі інтэрнат лічыўся працоўным інтэрнатам, аднак за час яго існавання ніводным з пражываючых у ім інвалідам не было набыта ніякай спецыяльнасці. Нягледзячы на наяўнасць абсталявання па вытворчасці абутку і шыцця, курсы па атрыманні прафесіі так і не былі наладжаны, паколькі адсутнічалі як спецыялісты па навучанні, так і неабходная сыравінная база [4, арк. 91].

Харчаванне ў інтэрнаце таксама забяспечвалася дрэнна. Кваліфікаваны повар адсутнічаў, меню было бедным. Сутачны рацыён інвалідаў складаў 500 г хлеба, 20 г тлушчоў, 70 г мяса, 20 г цукру, 60 г крупы. Велімі часта выкарыстоўваліся замяняльнікі (кансервы, сушаная бульба, лярд), што значна паніжала каларыйнасць харчавання. Прадукты выдаваліся несвоечасова.

Апісанае вышэй становішча неадпаведнага ўтрымання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны мела пад сабой цэлы шэраг падстаў. Паколькі інтэрнат з'яўляўся рэспубліканскім, то Хойніцкая раённая партыйная арганізацыя надавала вельмі мала ўвагі яго забеспячэнню. У выніку ў адміністрацыі інтэрната заўсёды ўзнікалі цяжкасці з атрыманнем у райспажыўсаюзе прадуктаў харчавання. Міністэрства сацыяльнага забеспячэння таксама слаба цікавілася ўстановай, якая знаходзілася ў яго падведамстве. За ўвесь 1946 год інтэрнат для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны не наведаў ніводны прадстаўнік з міністэрства. Словам, аб сапраўдным становішчы, у якім знаходзіўся інтэрнат і пражываючыя ў ім былыя франтавікі, проста ніхто не ведаў [4, арк. 91].

Падобная сітуацыя была хоць і не характэрнай для ўсіх інтэрнатаў, але дастаткова распаўсюджанай па рэспубліцы. Так, вынікі праверкі забеспячэння Слуцкага дому інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, якая была праведзена 9 лютага 1950 г., паказалі, што будынак, дзе жылі інваліды, знаходзіўся ў закінутым стане. У палатах было брудна і холадна. Палівам інтэрнат не забяспечваўся, з-за чаго інваліды вымушаны былі спаць у верхняй вопратцы. Некаторыя жыхары хварэлі на педыкулёз. Прадукты харчавання, якія прызначаліся для інвалідаў, расходаваліся не па прызначэнні. Напрыклад, дырэктар дома А.Я. Белаконеў, выкарыстоўваючы сваё

службовае становішча, прадаў кабана па заніжаным кошце, яшчэ аднаго па такім жа нізкім кошце забраў сабе [5, арк. 41].

Калі для дэмабілізаваных франтавікоў пераход да мірнага жыцця мог выклікаць складанасці толькі пры пошуку працы, то для інвалідаў вайны сітуацыя ўскладнялася цэлым шэрагам фактараў фізічнага і псіхалагічнага характару. Вострым і неадназначным пытаннем з'яўлялася працаўладкаванне інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Першыя пасляваенныя гады былі часам станаўлення і фарміравання сістэмы сацыяльнага забеспячэння ў краіне. Зразумела, што ў гэты перыяд аказаць паўнацэнную дапамогу ўсім інвалідам было немагчыма па прычыне недахопу матэрыяльных сродкаў і недасканаласці самой сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Нярэдка прычынай маруднага вырашэння праблем дэмабілізаваных па стане здароўя франтавікоў з'яўляліся чалавечая абыякавасць і неахайныя адносіны да сваіх абавязкаў на месцах. Усё гэта ў сукупнасці ўскладняла штодзённае жыццё інвалідаў вайны. Нягледзячы на захады з боку Урада па навучанні і перанавучанні іх новым прафесіям і спецыяльнасцям, а таксама шэраг загадаў і пастаноў аб прадастаўленні працоўных месц у першую чаргу інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, на справе ўсё было інакш. Часта інваліды, якія вярнуліся на вытворчасць, былі прадастаўлены самі сабе. Нярэдка інваліды былі вымушаны згаджацца на любую прапанаваную ім працу. Ні шматлікія дрэнна абсталяваныя (ва ўмовах пасляваеннага часу) навучальныя ўстановы сабесаў, ні прадпрыемствы, якія знаходзіліся пад прэсам выканання плану, не былі ў стане ці ўвогуле не імкнуліся забяспечыць перакваліфікацыю інвалідаў у поўнай меры. У выніку значная іх колькасць вымушана была задаволіцца некваліфікаванай працай, аплата за якую нярэдка складала ўсяго трэцюю частку ад звычайнага заробку. Акрамя таго, праца вартаўніка ці вахцёра не прадугледжвала ніякіх даплат. Сітуацыя пагаршалася слабай арганізацыяй працы не толькі на месцах, але нават у Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння. Найбольш востра гэта праявілася ў першыя гады пасля вайны, калі пры выканкамах, і нават у міністэрстве, адсутнічалі звесткі пра месцазнаходжанне створаных камісій па прадастаўленні рабочых месц інвалідам Вялікай Айчыннай вайны [4, арк. 2].

У многіх сабесах не прымалася элементарных мер па арганізацыі ўліку з наступным працаўладкаваннем франтавікоў-інвалідаў. Так, па Мінскай вобласці аблвыканкам не праводзіў ніякага ўліку дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі. Па горадзе Барысаве і Барысаўскім раёне, а таксама па Сталінскім раёне горада Мінска не вёўся ўлік спецыяльнасцей дэмабілізаваных франтавікоў. Па Кагановічскім раёне ўвогуле не праводзіўся ніякі ўлік. Па Гомельскай вобласці на 20 верасня 1945 года так і не мелася звестак аб колькасці прынятых на працу дэмабілізаваных і аб памерах прадастаўленай ім дапамогі [6, арк. 25]. Планы працаўладкавання інвалідаў на 1946 год таксама не былі складзены як у міністэрстве, так і ў арганізацыях сацыяльнага забеспячэння на месцах. Як вынік – за 1946 год з агульнай колькасці дэмабілізаваных па стане здароўя франтавікоў не было працаўладкавана 15814 чалавек з 38851, што складала 39%. На працягу 9 месяцаў 1946 года па пытанні працаўладкавання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны Міністэрствам сацыяльнага забеспячэння былі праверany толькі 2 аблсабесы: Мінскі і Бабруйскі [7, арк. 2].

Пасля заканчэння вайны мільёны дэмабілізаваных былі заняты пошукамі працы. Гэта істотна паўплывала на павелічэнне выпадкаў звальнення інвалідаў, прымусова прынятых на працу падчас вайны. Нават у кааператывах была занята практычна такая ж колькасць інвалідаў, як і ў сярэднім на іншых савецкіх прадпрыемствах. Напрыклад, у арцелях Белкаапсавета з 6176 чалавек, якія працавалі, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны налічвалася толькі 959 чалавек, ці 15,5%, а здаровых працоўных 2384, ці 37,6%. У Баранавіцкай, Брэсцкай, Бабруйскай і Маладзечанскай абласцях працэнт здаровых працоўных перавышаў 60% [7, арк. 3].

Некаторыя старшыні калгасаў, спрабуючы пазбавіцца ад малапрадуктыўных інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, даносілі на іх, як на "туняядцаў", у кантралюючыя органы. Нават генеральны пракурор СССР у сваім дакладзе Вярхоўнаму Савету адзначаў рост у канцы 1940-х гадоў дыскрымінацыі інвалідаў вайны. Аднак ніякіх станоўчых зрухаў пасля выступлення па гэтай праблеме не было [8, с. 295–296].

Надзвычай актуальным было і жыллёвае пытанне. Частка дэмабілізаваных і інвалідаў па-ранейшаму жыла ў зямлянках. Асабліва цяжка было забяспечыць жыллём дэмабілізаваных у г. Мінску. Раённымі гарадскімі камісіямі выканкамаў прымаліся меры па задавальненні іх жыллём, аднак пытанне доўгі час не страчвала сваёй актуальнасці [6, арк. 17–19].

Нізкае становішча інвалідаў вайны ў працоўнай іерархіі азначала абмежаваны доступ да рэсурсаў сацыяльнага забеспячэння на прадпрыемствах. Асабліва выразна гэта назіралася пры размеркаванні жылплошчы, якая ў гады вайны набыла асаблівую каштоўнасць. Згодна з пастановамі ўрада інваліды Вялікай Айчыннай вайны павінны былі забяспечвацца жыллём у першую чаргу. Аднак нярэдка прадпрыемствы клапаціліся перш за ўсё аб здаровых кваліфікаваных працоўных кадрах, у якіх мелі вострую патрэбу. Для інвалідаў вайны заставаліся баракі без вады, электрычнасці і ацяплення. Звольненыя ў запас абаронцы Радзімы, якія не мелі сваёй жылплошчы, былі вымушаны жыць на падсяленні ў чужых кватэрах або разам з сем'ямі родных ці сваякоў [6, с. 295].

Аднак не ўсе былыя франтавікі маглі разлічваць на дапамогу родных: у некаторых пасля вайны нікога не засталося, другія дабраахвотна адмаўляліся ад дапамогі сваякоў, бо не хацелі іх турбаваць. Значнай колькасці дэмабілізаваных франтавікоў-інвалідаў прыйшлося самастойна вырашаць свае праблемы. Па гэтай прычыне многія з іх аказваліся ў вельмі складаных матэрыяльных і псіхалагічных умовах.

У шэрагу гарадоў, каб нейкім чынам зменшыць патрэбу ў прадуктах першай неабходнасці, інвалідам Вялікай Айчыннай вайны выдаваліся аднаразовыя грашовыя і матэрыяльныя дапамогі. Аднак вёска, у якой пражывала больш за палову ўсіх дэмабілізаваных інвалідаў, заставалася практычна ні з чым. Для забеспячэння патрэб вяскоўцаў існавалі толькі калгасныя касы ўзаемадапамогі. Але іх арганізацыя ішла маруднымі тэмпамі, а там, дзе касы былі створаны, іх дзейнасць была малаэфектыўнай, бо залежала ад работы саміх калгасаў [9, с. 295]. Частымі былі выпадкі, калі касы існавалі толькі на паперы і не аказвалі ніякай дзейснай дапамогі франтавікам-інвалідам, якія пражывалі ў вёсцы [9, арк. 8–11].

Адной з самых істотных форм забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны з'яўлялася выплата пенсій. З боку ўрада быў наладжаны пільны кантроль за выплатамі, доказам чаго стала асабістая адказнасць, ускладзеная на загадчыкаў аблсабесамі за арганізацыю і правядзенне своечасовага кантролю за ўсімі зноў прызначанымі райгарсабесамі пенсійнымі справамі і пераразлікамі. Для эфектыўнасці і мэтавасці выплат пенсій прадпісвалася праводзіць дакладны ўлік правяраемых пенсійных спраў і штоквартальна паведамляць у міністэрства аб іх колькасці, а ўсе сумы пераплат спаганяць з вінаватых [10, арк. 8].

Нягледзячы на сур'ёзнасць прыведзеных вышэй мер, поўнасцю пазбавіць пенсійную сістэму істотных хібаў не атрымлівалася. Вялікая колькасць спрэчных пытанняў узнікала ў першыя гады пасля вайны, калі з-за недахопу кадраў і арганізацыйных праблем налічэнне і падлік пенсій былі недакладнымі, а іх выдача – нерэгулярнай. Скаргі і заявы, якія ў першы раз паступалі ў аддзел прызначэння пенсій, часцей за ўсё перасылаліся на разгляд у ніжэйшыя органы ўлады – аблсабесы і райсабесы. У выніку міністэрства з'яўлялася як бы перасыльным пунктам першасных скарг і заяў інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Па гэтай прычыне часта паступалі паўторныя скаргі, якія разглядаліся фармальна, няўважліва, потым пачыналася бясконцая перапіска. Арганізацыйныя праблемы былі актуальнымі і праз дзесяць год пасля вайны [10, арк. 8].

Да прыкладу, І.А. Апанасевічу, які страціў на вайне руку і ў 1945 годзе дэмабілізаваўся, Крычаўскім райсабесам як інваліду вайны II групы была прызначана пенсія ў памеры 96 рублёў, якая выплочвалася з 1945 па 1948 год. У 1948 годзе райсабес папрасіў прадаставіць інваліда вайны арыгінал пасведчання аб хваробе, які быў згублены. Пасля чаго райсабес запатрабаваў архіўныя звесткі аб раненні і спыніў выплату пенсіі. І.А. Апанасевіч пісаў: "Я паўсюль, дзе было толькі можна, скардзіўся і нідзе канцоў не дабіваўся". Ён звяртаўся ў райсабес у 1948, 1953, 1954 гадах, пісаў Варашылаву, Молатаву, Булганіну, – усе заявы накіроўваліся і разглядаліся Міністэрствам сацыяльнага забеспячэння БССР. Крычаўскім райсабесам была запатрабавана даведка аб раненні І.А. Апанасевіча з ваенна-медыцынскага музея. Па ўстанаўленні УПЭК група інваліднасці яму была прызначана толькі з 15 верасня 1954 года, а не з дня яе прыпынення, у сувязі з чым ён напісаў яшчэ 4 скаргі аб выплаце яму пенсій за мінулы час [10, арк. 16].

Толькі пасля трэцяй скаргі, якая была надрукавана ў газеце "Праўда", Міністэрства сацыяльнага забеспячэння зрабіла запыт з Крычаўскага райсабеса аб пенсійнай справе Апанасевіча. Высветлілася, што былая перапіска з Маладзечанскім аблсабесам прывяла да блытаніны, паколькі паведамляліся недак-

ладныя дадзеныя. Напрыклад, у адказ на адну са скаргаў, у лютым 1955 года загадчык Маладзечанскім аблсабесам пісаў, што Апанасевічу Крычаўскім раённым аддзелам сацыяльнага забеспячэння выплочвалася пенсія і пры адсутнасці дакументаў. 12 мая 1955 года супрацоўнікамі Крычаўскага райсабесу паведамлялася, што ў 1948 годзе Апанасевіч звяртаўся за пенсіяй, але яна не была яму прызначана па прычыне таго, што інвалідам вайны не было прадастаўлена пасведчанне аб хваробе, якое ён катэгарычна адмовіўся прадаставіць, матывуючы гэта тым, што дастаткова і копіі, зацверджанай натарыусам.

26 мая 1955 года выконваючы абавязкі загадчыка Маладзечанскім аблсабесам Ю. Яблакава паведамляла, што пенсія І.А. Апанасевічу была прызначана Крычаўскім райсабесам 9 лютага 1948 года па копіі пасведчання аб хваробе, зацверджанай райвыканкамам, у адсутнасці заключэння ваенна-ўрачэбнай камісіі, у гэтым жа годзе выплата Апанасевічу была спынена.

Толькі 13 ліпеня 1955 года з Маладзечанскага аблсабеса і Крывіцкага райсабеса быў атрыманы адказ, што пенсія Апанасевічу з 15 верасня 1954 года была ўстаноўлена правільна. Такая блытаніна і недакладнасці прыводзілі да валакіты ў разглядзе скарг і заяў, значна ўскладнялі і без таго цяжкае паўсядзённае жыццё інвалідаў.

Прыведзены вышэй прыклад няўважлівых адносін улады да праблем інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны быў не адзінкавы. Так, 16 сакавіка 1955 года ў прыёмную Міністра абароны СССР паступіла пісьмо ад інваліда Вялікай Айчыннай вайны І.А. Кухарчука, які пражываў у Жабінкаўскім раёне Брэсцкай вобласці. Пенсіянер цікавіўся, чаму яму спынілі выдачу пенсіі як інваліду ІІІ групы. Гэта заява была не зарэгістравана і разгледжана, а проста падшыта разам з перапіскай інваліда Вялікай Айчыннай вайны Апанасевіча з Магілёўскай вобласці. У выніку Кухарчук другі раз 2 ліпеня 1955 года звярнуўся са скаргай у прыёмную Міністра абароны СССР, дзе прасіў даць адказ на яго папярэднюю скаргу аб нявыплаце пенсіі [11, арк. 17].

Памер пенсій залежаў ад воінскага звання і ад групы інваліднасці, а тым, хто быў прызваны на ваенную службу адразу пасля школы і не мог прадаставіць даведак аб сваіх даходах да мабілізацыі, выплочвалася аднолькавая, невялікая па памеры грашовая дапамога. Нягледзячы на ўсе хібы ў арганізацыі, выплата пенсій была адзінай дзейснай мерай у арсенале дзяржаўнай палітыкі сацыяльнага забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Аднак у адрозненні ад іншых аспектаў гэтай палітыкі, пенсіі практычна ніяк не выкарыстоўваліся дзяржавай у прапагандысцкіх мэтах. Лічылася, што празмернае завастрэнне ўвагі да дзяржаўнага пенсійнага забеспячэння будзе садзейнічаць распаўсюджванню “спажывецкай свядомасці” [8, с. 291–292].

Неад’емнай часткай пасляваеннай штодзённасці інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны з’яўлялася медыцынская дапамога. Стомленасць і псіхалагічная напружанасць, што накапіліся за час знаходжання на фронце, нагадвалі пра сябе і пасля дэмабілізацыі. Многія франтавікі са здзіўленнем адзначалі, што на вайне, пастаянна знаходзячыся паміж жыццём і смерцю, людзі амаль не хварэлі “мірнымі” хваробамі. Але пасля заканчэння вайны хваробы адразу нагадалі пра сябе. Узнікла патрэба ў лячэнні не толькі франтавых раненняў, але і іншых захворванняў. Разам з тым існуючая сістэма медыцынскага забеспячэння была далёкай ад ідэалу і не магла задавальняць патрэбы дэмабілізаваных і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Інваліды, якія былі выпісаны са шпіталя, часта траплялі ў значна горшыя ўмовы. Яны былі вымушаны сядзець у чэргах, каб атрымаць рэнтгенаўскую ці тэрапеўтычную дапамогу.

У адпаведнасці з прынятымі правіламі, інваліды Вялікай Айчыннай вайны раз у год павінны былі для пацвярджэння інваліднасці праходзіць медыцынскае пераасведчанне. Гэтай працэдуры падлягалі нават тыя, хто страціў на фронце руку ці нагу. У асноўным гэта была моладзь. Усведамленне сваёй непатрэбнасці ў пасляваенным грамадстве, дзеля якога яны ахвяравалі сабой, было надта балючым. Перажытая імі душэўная траўма часта мела нават больш глыбокія наступствы, чым фізічная знявечанасць. Але атрымаць якасную псіхалагічную дапамогу ў інвалідаў не было магчымасці па прычыне адсутнасці спецыялістаў [2, с. 30].

Ва ўмовах пасляваеннай разрухі лякарні і паліклінікі працавалі з вялікай напружанасцю, паколькі большасць з неабходных медыцынскіх кадраў (хірургі, артапеды) былі задзейнічаны на фронце, а пасля заканчэння вайны – у шпітальнай сетцы. Умовы лячэння і праходжання медыцынскага агляду таксама не заўсёды адпавядалі нават мінімальным санітарным нормам.

Так, 25 сакавіка 1947 г. у Маладзечанскім райсабесе павінны былі прайсці пераасведчанне 46 з 201 інваліда Вялікай Айчыннай вайны. Парушаючы ўсе санітарна-гігіенічныя нормы і "Палажэнне Аб УПЭК" ад 5 снежня 1942 г., пераасведчанне праводзілі не амбулаторна ў паліклініках, а ў памяшканні Вялікасельскага сельскага савета. Спецыяльнага памяшкання не было адведзена, і агляд праводзіўся ў канцылярыі. У такіх антысанітарных умовах інваліды з адкрытымі ранамі маглі лёгка захварэць [10, арк. 8].

Надзённым заставалася пытанне забяспечанасці пратэзамі. З-за недастатковага кантролю за вытворчым працэсам і неахайнага выканання заказаў, якасць пратэзаў доўгі час заставалася нізкай. Пратэзныя прадпрыемствы гатовыя вырабы не сартавалі і не маркіравалі. Брак і сапсаваныя матэрыялы не ўлічваліся і не адлюстроўваліся ў балансах прадпрыемстваў. Тэрміны вырабу пратэзаў таксама парушаліся. На Мінскім пратэзным заводзе ў 1946 годзе выраб пратэзаў зацягваўся ад 2 да 4 месяцаў. У Гомельскай пратэзнай майстэрні за 11 месяцаў 1946 года з 1347 пратэзаў са спазненнем было выраблена 1009 ці 74,9% [12, арк. 8].

Праблема забеспячэння якаснымі пратэзамі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны заставалася адной з самых вострых і праз дзесяць год пасля вайны. Між тым для былых франтавікоў, якія фізічна былі абмежаваны ў выбары працы, якасць пратэзаў з'яўлялася жыццёва важным пытаннем. Ад гэтага залежала магчымасць іх працаўладкавання і проста паляпшэнне жыцця. Аднак справа на прадпрыемствах у гэтым кірунку ішла вельмі марудна. Дэфекты ў вытворчасці пратэзных вырабаў не вывучаліся мэтанакіравана, і, адпаведна, ніякіх захадаў па ліквідацыі прычын браку не прымалася. Няякасныя пратэзныя вырабы выпускаліся вельмі часта, што выклікала абурэнне і справядлівыя нараканні сярод франтавікоў, страціўшых здароўе. У прыватнасці, інвалід Вялікай Айчыннай вайны К.А. Тусікаў з Чачэрскага раёна ў сваёй скарзе заяўляў, што абодва пратэзы, вырабленыя для яго ў Гомельскай майстэрні, былі нізкай якасці, бо хутка ламаліся металічныя часткі, сістэматычна зрываліся балты, якія прымацоўвалі сцягно да карсета. У выніку хадзіць у іх было вельмі складана і балюча. Інвалід В.М. Тарасенка заяўляў, што выраблены ў верасні 1955 года пратэз нагі за 11 месяцаў носкі рамантаваўся двойчы. Сам пратэз быў зроблены дрэнна: няякасныя заклёпкі хутка зношваліся, ламаліся і выпадалі з гнязда. З-за гэтага сядзенне адставала ад шыны, ламалася і замінала хадзьбе, паколькі не трымала нагу.

Інвалід Вялікай Айчыннай вайны Л.І. Драбышэўскі з Чачэрска скардзіўся на тое, што ў атрыманым у лістападзе 1955 года пратэзе нагі хутка лопнуў абадок сядзення, скура на пратэзе была нетрывалая, выкручвалася, пробкі знасіліся, не давалі амартызацыі і пераламаліся, стрыжні лопнулі на выгібах. І.Н. Ганчароў (з таго ж раёна) скардзіўся на тое, што ў пратэзе, які ён атрымаў у кастрычніку 1955 года, расхісталася ступня, не трымалі вінты, хутка вынасілася падложка і голы метал рэзаў цела да ран. Пратэз рамантаваўся ўжо двойчы за год. Аб няякаснасці пратэзных вырабаў Гомельскай майстэрні заяўлялі інваліды Брагінскага раёна Д.Т. Рабчанка, Н.Н. Сыцёнак, А.В. Шкляр, Х.А. Радчанка і іншыя [13, арк. 29–30].

Паколькі сістэма апавяшчэння аб гатоўнасці заказаў таксама працавала дрэнна, некаторыя інваліды вымушаны былі прыязджаць за вырабамі па некалькі разоў. Для таго каб атрымаць гатовы пратэз, А.А. Шарлоўскі з г.п. Беразіно, які знаходзіўся за 45 км ад бліжэйшай чыгуначнай станцыі і 112 км ад Мінска, ездзіў 5 разоў на Мінскі пратэзны завод. Столькі ж разоў ездзіў па пратэзы і інвалід П.Е. Пячута са Стаўбцоў. З 460 заказаў, прынятых у чэрвені–ліпені 1956 года, у 189 выпадках тэрміны на выраб пратэзнага і артапедычнага абутку былі парушаны. Пры тым, што ў 31 выпадку абутак не быў выраблены на працягу 60–95 дзён. За ўзгаданыя два месяцы 1956 г. з 422 заказаў, прынятых на выраб пратэзаў, тэрміны былі парушаны ў 117 выпадках [13, арк. 30].

На прыёмцы заказаў інвалідам ніколі не прызначаліся тэрміны прымеркі і вырабу пратэзаў, а пасля таго як пратэз быў выраблены, інваліды атрымлівалі апавяшчэнне па пошце, што таксама істотна зацягвала працэс. У майстэрні дрэнна быў скаардынаваны выраб адным і тым жа інвалідам пратэзаў ног і пратэзнага абутку. Частымі былі выпадкі, калі пратэзы былі выраблены, а абутак не.

Дрэнная каардынацыя справы прывяла да таго, што на складзе назапашвалася вялікая колькасць выраблена́й прадукцыі, прычым складзена яна была навалам і таму дэфармавалася. Яшчэ адной прычынай парушэння тэрмінаў было тое, што ў некаторых майстэр-

нях вырабляўся абутак без адпаведных дакументаў органаў сацыяльнага забеспячэння для сваіх супрацоўнікаў, а таксама асоб, якім можна было вырабіць пратэзы ў іншых майстэрнях. Так, у парушэнне інструкцыі ў 1955 – 1-м квартале 1956 года ў Магілёўскай майстэрні без дазволу органаў сацыяльнага забеспячэння было выраблена 48 пар абутку для сваіх супрацоўнікаў. Пры гэтым некаторым з іх было выраблена па чатыры пары. Здараліся выпадкі, калі асобам, якія не мелі ў сям'і дзяцей, выраблялся дзіцячы абутак. Нярэдка па дакументах інваліда выраблялся абутак не інваліду [13, арк. 9–11].

На першы квартал 1956 года ў рэспубліцы 959 інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны карысталіся мотакалясками, галоўным чынам маркі СІ-Л Серпухаўскага мотавелазавода. Але патрэба ў мотакалясках была істотнай. У сувязі з гэтым з 1 верасня 1956 г. Магілёўская пратэзная майстэрня стала іх выпускаць. Аднак і тут не абыйшлося без праблем. Інваліды, якія карысталіся мотакалясками, дрэнна забяспечваліся запаснымі часткамі да іх. Арганізаванага рамонту мотакалясак у горадзе Магілёве і вобласці наладжана не было. Велакалясак для інвалідаў не хапала [13, арк. 20]. Якасць калясак таксама заставалася нізкай: інваліды Вялікай Айчыннай вайны I групы М.Г. Мядзведзеў (Полацк), А.І. Мальцаў (Новабеліца), П.Е. Сялюк (Гомель) скардзіліся на нізкія магутнасць матора каляскі і пасадку кузава, нетрываласць задняга маста, малы дыяметр калёс. У выніку ў калясак была нізкая праходнасць, асабліва па пясчаных і заснежаных дарогах. Хутка ламаліся дзверкі, адбывалася самаадвольнае выключэнне хуткасці пры руху. Часта сустракаліся дрэнная зварка швоў кузава, а таксама няспраўнасць заваднога механізма [13, арк. 31].

**Заключэнне.** Такім чынам, пасляваенная штодзённасць інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны была супярэчлівай і неадназначнай. Усе захады, якія прымаліся органамі ўлады для паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў франтавікоў, прыносілі пэўныя вынікі. Аднак працэс укаранення ў практыку рашэнняў быў недасканалым. На месцах да інвалідаў вайны было таксама неадназначнае стаўленне. Асабліва востра гэта праблема адчувалася ў плане працоўнага забеспячэння, дзе эканамічныя рэаліі прадпрыемстваў супярэчылі таму, каб прымаць на працу інвалідаў вайны, паколькі гэта патрабавала стварэння адпаведных для іх умоў і адмоўна ўплывала на вытворчыя паказчыкі прадпрыемства.

Складана вырашалася праблема пратэзавання скалечаных на вайне франтавікоў. Калі пытанне забяспечанасці пратэзамі ў асноўным было вырашана, то якасць пратэзаў заставалася вельмі нізкай і праз дзесяць год пасля вайны. Гэта не толькі выклікала справядлівыя нараканні з боку франтавікоў-інвалідаў, але і адмоўна адбівалася на іх псіхалагічным стане. Так як тагачасная сістэма сацыяльнага забеспячэння не займалася праблемамі псіхалагічнага характару, дэмабілізаваныя абаронцы Радзімы былі вымушаны самастойна прызвычайвацца да новай, пасляваеннай рэчаіснасці. Адаптацыя да мірнага жыцця ў былых франтавікоў праходзіла па-рознаму. Адны з іх імкнуліся па меры сваёй магчымасці пераадолець цяжкасці і вярнуцца да нармальнага жыцця, другім гэта давалася значна цяжэй. На светабачанне інвалідаў вайны ўплывалі не толькі іх асабістыя якасці, але і тыя ўмовы, у якіх апынуліся франтавікі пасля дэмабілізацыі. Вялікую ролю адыгрывала і тое, як пасля вяртання ўспрымала скалечанага ваеннай чалавека яго сям'я. Таму, хто пасля вайны застаўся адзін, значна цяжэй было ўсведамляць раўнадушша чыноўнікаў на месцах. Нярэдка такія франтавікі не маглі прыстасавацца да абставін і адчувалі сябе значна горш, чым у ваенны час.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ковалева, А.И. Адаптация социальная / А.И. Ковалева // Социологическая энциклопедия: в 2 т. – М., 2003. – Т. 1.
2. Зубкова, Е.Ю. Послевоенное советское общество: политика и повседневность. 1945–1953 / Е.Ю. Зубкова – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 1999. – 229 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 4п. – Воп. 51. – Спр. 10.
4. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 3. – Спр. 308.
5. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 53. – Спр. 19.
6. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 3. – Спр. 308.
7. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 2. – Спр. 54.
8. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 3. – Спр. 317.
9. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 12. – Спр. 235.
10. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 4. – Спр. 327.
11. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 13. – Спр. 208.
12. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 1. – Спр. 302.
13. НАРБ. – Фонд 690. – Воп. 13. – Спр. 201.


*Пастунпіў у рэдакцыю 11.12.2014 г.*

*Прыняты ў друк 29.12.2014 г.*